школы – выработать умение интерпретации и создания текста. Все это станет базой профессионального обучения в случае выбора филологической специальности.

Современное непрерывное филологическое образование, основанное на преемственности, имеет прежнюю цель профессионального развития, однако располагает новыми формами преподавания и усвоения знаний.

**Литература**


1. Лихачев, Д. С. Об искусстве слова и филологии [Электронный ресурс] // О филологии / Д. С. Лихачев ; предисл. Л. А. Дмитриева. – М. : Высшая школа, 1989. – С. 204–208. – Режим доступа : https://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Linguist/Lih/12.php. – Дата доступа : 09.01.2023.

2. Аверинцев, С. С. Похвальное слово филологии [Электронный ресурс] / С. С. Аверинцев // Юность. – 1969. – № 1. – С. 98–102. – Режим доступа : http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Literat/aver/pohv_sl.php. – Дата доступа : 09.01.2023.

3. Орешкина, А. К. Методологические основы преемственности образовательного процесса в системе непрерывного образования : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01 / А. К. Орешкина ; Ин-т теории и истории педагогики РАО. – М., 2009. – 46 с.



*УДК 37.013.73:37.091(430):929*Гумбальдт:378.4*



***В. У. Цацарын***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*


## ГУМБАЛЬДТАЎСКАЯ МАДЭЛЬ АДУКАЦЫІ І ЯЕ РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў СУЧАСНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Сярод існаваўшых мадэлей адукацыі ў свеце нярэдка высока ацэньваецца прапанаваная ў свой час прускім міністрам адукацыі В. Гумбальдтам. Разгледзім яе асновы і выкажам меркаванні наконт магчымасці (і патрэбы) у яе рэалізацыі ў сучаснай вышэйшай школе.

Сітуацыя ў Прусіі на пачатку XIX ст. у галіне адукацыі была вельмі дрэннай. Была абвешчана ўсеагульная сярэдняя адукацыя, аднак з-за дрэннага фінансавання і адсутнасці сістэмнасці далей за дэкларацыю справа не ішла, бо не існавала нават асобнага міністэрства адукацыі, не тое што агульных планаў, падручнікаў, праграм. Нават сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў не існавала, а прапаноўваемыя заробкі не прываблівалі адукаваных людзей займацца гэтай дзейнасцю.

Штуршком да змены сітуацыі ў Прусіі называюць яе паражэнне ад войскаў Напалеона I. Рэформа адукацыі была адной з шэрагу праведзеных змен у краіне, накіраваных на яе мадэрнізацыю. Доўгатэрміновай яе мэтай лічаць змену самой свядомасці людзей. Ставілася задача стварыць грамадства адукаваных, свабодна мыслячых людзей для ліберальнай эканомікі. Чалавек павінен быў умець мысліць, а не падладкоўвацца да традыцыйнага свету. Відавочна тут апора на філасофію І. Канта, які лічыў адным з галоўных атрыбутаў чалавека яго свабоду, І. Фіхтэ, Ф. Шэллінга. В. Гумбальдт, які тады быў прызначаны міністрам і атрымаў заданне рэфармаваць сістэму адукацыі, развіваючы гэтыя ідэі, выразіў іх у паняцці “духоўная культура”, разумеючы пад ёй рэлігійна-маральныя ўяўленні, што вядуць да ўдасканальвання асобы чалавека і адначасова прыводзяць да паляпшэння жыцця грамадства [1].

Канцэпцыя вышэйшай адукацыі Гумбальдтам была распрацавана, як адзначаецца, пад уплывам ідэй Г. Штэффенса і Ф. Шлейермахера. Расійскі даследчык К. Д. Скрыпнік у якасці феномена, які паўплываў на саму магчымасць Гумбальдта сфармуляваць свой падыход да

універсітэцкай адукацыі, называе навуковую рэвалюцыю XVII ст. Ён адзначае, што, дзякуючы гэтай рэвалюцыі, змяніліся самі метады атрымання і развіцця навуковых ведаў, арганізацыі адукацыйнага і даследчыцкага працэсу. Змянілася ментальнасць выкладчыка і студэнта [2, с. 56–57].

В. Гумбальдт радыкальна перавызначыў функцыю вышэйшай адукацыі. Універсітэт павінен стаць цэнтрам нацыянальнага адраджэння і абнаўлення, захоўваць нацыянальны дух народа, быць сродкам падтрымання нацыянальнага гонару. Фундаментальным для такога подыходу з'яўляецца сцвярджэнне, што сапраўдны ўніверсітэт удзяляе аднолькавую ўвагу даследчыцкай і адукацыйнай дзейнасці. Апорным для В. Гумбальдта становіцца паняцце "Wissenschaft", якое ў дадзеным кантэксце набывае сэнс "даследчыцкай адукацыі". Задача прафесуры – развіваць самастойнае мысленне студэнтаў. Навучанне разумеецца як абаюдны працэс, які аб'ядноўвае намаганні студэнтаў і прафесараў. Максімамі ўніверсітэту становяцца "Lernfreihait" и "Lehrfreihait" – "вольнае навучанне" і "вольнае выкладанне" [3, с.57].

Асноўнымі прынцыпамі ідэі ўніверсітэта, якія вызначыў В.Гумбальдт, называюць наступныя:

1. Веды патрэбна цаніць дзеля іх саміх, а не дзеля прыносімай імі карысці.

2. Эмпірычныя навукі панаваць не павінны, бо гэта супярэчыць фундаментальна-тэарэтычнаму пазнанню.

3. Без гуманітарнай адукацыі асоба адукаванай стаць не можа.

4. Без маральных перакананняў і інтарэсаў навуковыя веды перарастаюць у духоўны матэрыялізм [4, с. 74].

Інтэрпрэтуюцца гэтыя прынцыпы наступным чынам. Акадэмічныя свабоды: выкладчык выбірае сам, што і якім чынам выкладаць, задаецца прадмет, а не змест. Студэнты маюць свабоду выбіраць вывучаемыя дысцыпліны. Навучальны працэс з'яўляецца адначасова і навуковым – веды не толькі перадаюцца, але і памнажаюцца. Навучанне ладзіцца як даследчыцкі працэс як для выкладчыкаў, так і для студэнтаў. Формулу Гумбальдта вызначаюць, як "не настаўнік для вучня, не вучань для настаўніка, але абодва яны – для навукі" [3, с. 49]. Менавіта даследчыцкія якасці павінны вызначаць магчымасць працаваць ва ўніверсітэце. Нарэшце, уводзіцца паняцце "адзінства навукі" як вяршыні разумовай дзейнасці: не ідэал Асветніцтва – энцыклапедычнасць, а навучанне методыцы навуковага пазнання, фарміраванне адзінай філасофскай карціны свету.

Разумеючы навуку як бясконцы працэс, В. Гумбальдт адзначаў, што захоўваць і падтрымліваць гэты працэс павінна дзяржава. Пры гэтым не дзяржава з'яўляецца прычынай навуковага працэсу, але яна можа стаць яго перашкодай, калі не прадаставіць яму дастатковай свабоды [3, с. 56]. Тое ж датычыць і самога ўніверсітэта, дзе не павінна скласціся сітуацыя поўнай перавагі аднаго навуковага падыходу (па тэрміналогіі Гумбальдта – аднаго пэўнага духу), а ўсе астатнія – падаўляцца.

Даследчыкі не адмаўляюць уплыў мадэлі менавіта як тэорыі. Аднак, напрыклад, А. Ю. Андрэеў сцвярджае, што на гумбальдтаўскіх прынцыпах не працаваў ніколі і ніводны ўніверсітэт у свеце [3, с. 50]. Сам ініцыятар зменаў сыйшоў у адстаўку да таго, як берлінскі ўніверсітэт пачаў сваю дзейнасць. А пераемнікі тут жа адышлі ад прапанаваных ім ідэй.

Там жа, дзе нейкія з іх спрабавалі ўвасобіць, атрымлівалася карціна іншая, чым малявалася Гумбальдту. Так, засяроджанасць на навуковых даследаваннях прыводзіла да таго, што з універсітэтаў паступова вылучаліся іх часткі ў якасці навуковых устаноў. Спецыялізацыя навук, што адбывалася ў XIX ст., перашкодзіла рэалізацыі ідэі адзінства ведаў.

Калі браць у цэлым, то наша сістэма вышэйшай адукацыі іншая, чым тая, якую распрацоўваў В. Гумбальдт. Напэўна, сучасны "масавы" ўніверсітэт не можа засноўвацца на ідэях прускага рэфарматара.

Тым не менш, нельга сказаць, што дадзены падыход зусім не рэалізуецца. На большасцях спецыяльнасцей нашых УВА студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя работы, удзельнічаюць у навуковых канферэнцыях. Існуюць навуковыя таварыствы (СНДЛ). Тут ужо выкладчыкі маюць магчымасць больш цесна і прадуктыўна працаваць у навуковых адносінах са студэнтамі. Вынік такой працы – не проста дыпломныя работы, а работы, што маюць

пэўны сапраўды навуковы характар. Іх аўтары пасля заканчэння УВА нярэдка не пакідаюць навуку, ідуць вучыцца ў магістратуры, аспірантуры, абараняюць дысертацыі. Зразумела, гэта не гумбальтдаўская мадэль у чыстым выглядзе. Аднак ёсць упэўненасць, што ў чыстым выглядзе яна ў сучасным свеце і не патрэбна, бо амаль стопрацэнтная вышэйшая адукацыя выкліча тое, што амаль усе стануць навукоўцамі – гэта не патрэбна ні грамадству, ні дзяржаве.

**Літаратура**

1. Гумбольдт, Вильгельм. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Гумбольдт,_Вильгельм. – Дата доступа: 20.11.2022.

2. Скрипник, К. Д. Великая хартия университетов и основания ее стереотипов [Электронный ресурс] / К. Д. Скрипник. – Режим доступа: https://elar.urfu.ru/bitstream/10995/30243/1/iurp-2015-135-06.pdf. – Дата доступа: 20.11.2022.

3. Андреев, А. Ю. Гумбольдтовская модель классического немецкого университета [Электронный ресурс] / А. Ю. Андреев. – Режим доступа: https://library.by/ portalus/modules/pedagogics/ readme.php?subaction=showfull&id=1623417509&archive=&start_from=&ucat=&. – Дата доступа: 20.11.2022.

4. Сантоцкая, К. Э. Эволюция идеи университета [Электронный ресурс] / К. Э. Сантоцкая // Векторы благополучия: экономика и социум. – 2020. – №1. – Режим доступа: https://earchive.tpu.ru/bitstream/11683/62060/1/jwt-983.pdf. – Дата доступа: 20.11.2022.

***УДК 811.161.3’367.335.2***

***Н. П. Цімашэнка***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# РАЗМЕЖАВАННЕ ДАДАНЫХ ЧАСТАК У СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫМ СКАЗЕ

У сістэму профільных дысцыплін спецыяльнасці “Беларуская філалогія” ўваходзіць курс “Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)”, дзе прадметам вывучэння выступаюць словазлучэнні, простыя і складаныя сказы. У даным артыкуле наша ўвага будзе скіравана на праблемныя пытанні вывучэння складаназалежнага сказа, які разумеецца як складаны сказ, дзе пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў або злучальных слоў аб’ядноўваюцца сінтаксічна нераўнапраўныя прэдыкатыўныя часткі. Прэдыкатыўная частка, якая з’яўляецца сінтаксічна незалежнай, лічыцца галоўнай. Прэдыкатыўная частка, якая знаходзіцца ў сінтаксічнай залежнасці ад другой, лічыцца дададанай. Фармальным паказчыкам гэтай залежнасці выступаюць падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы, якія знаходзяцца ў даданай частцы.

Паміж галоўнай і даданай часткамі існуюць наступныя віды семантыка-сінтаксічных адносін: суб’ектныя, працэсуальныя (прэдыкатыўныя), аб’ектныя, атрыбутыўныя (азначальныя) і розныя віды акалічнасных адносін. У лінгвістычнай літаратуры няма адзінай класіфікацыі складаназалежных сказаў. У беларускім мовазнаўстве яна заснавана на функцыянальным прыпадабненні даданай часткі да адпаведных членаў сказа. У залежнасці ад гэтага вылучаюць даданыя дзейнікавыя, выказнікавыя, дапаўняльныя, азначальныя і акалічнасныя. Сярод апошніх выдзяляюцца разнавіднасці. У свой час гэтую класіфікацыю прапанаваў Ф.І. Буслаеў. Недахоп гэтай класіфікацыі – у аднабаковасці падыходу да складаназалежнага сказа, паколькі не ўлічваліся функцыя і структура даданай часткі, характар адносін паміж часткамі, структурныя асаблівасці ўсяго сказа ў цэлым. Згодна з гэтай класіфікацыяй складаназалежныя сказы з аднолькавымі сэнсавымі адносінамі паміж